УДК 37.035.6:821.161.3 “12/16”

# ІДЭІ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў СТАРАЖЫТНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**М. М. Шчэрбін**
кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры гісторыі і грамадазнаўчых дысцыплін
Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна
г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь
E-mail: *marina.sherbin@mail.ru*

*У артыкуле разглядаюцца ідэі грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў старажытнай беларускай літаратуры. На прыкладзе творчай спадчыны беларускіх асветнікаў-гуманістаў (Ф. Скарыны, С. Буднага, С. Полацкага, Я. Л. Намыслоўскага, Л. Сапегі, А. Волана) вызначаны вядучыя рысы і якасці чалавека-патрыёта і грамадзяніна. Устаноўлены ключавыя гісторыка-культурныя фактары і выяўлены ідэйна-тэарэтычныя крыніцы, якія ўплывалі на эвалюцыю змястоўнага напаўнення грамадзянска-патрыятычнага выхавання на беларускіх землях у перыяд ВКЛ. Адзначаны важны дыдактычны патэнцыял традыцый грамадзянска-патрыятычнага выхавання, характэрны для старажытнай беларускай літаратуры. Акрэслены магчымасці інтэрпрэтацыі гісторыка-культурнага вопыту нашых продкаў у грамадзянска-патрыятычным выхаванні маладога пакалення ў сучасным адукацыйным працэсе.*

***Ключавыя словы:*** *традыцыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання, грамадзянска-патрыятычныя рысы і якасці асобы, пераемнасць, патрыятызм, грамадзянскасць, літаратурная спадчына.*



МГПУ им. И.П.Шамякина

# IDEAS OF CIVIL-PATRIOTIC EDUCATION IN THE ANCIENT BELARUSIAN LITERATURE

**M. M. Shcherbin**
Candidate of Pedagogical Sciences, Head of the Department of History and Social Sciences
of the Mozyr State Pedagogical University named
after I. P. Shamyakin, Mozyr, Republic of Belarus
E-mail: *marina.sherbin@mail.ru*

*The article deals with the ideas of civil-patriotic education in the ancient Belarusian literature. On the example of the creative heritage of the Belarusian humanist enlighteners (F. V. Kolesnikov). Skorina, S. Budny, S. Polotsky, E. L. Namyslovsky, L. Sapegi, A. Volan) the leading traits and qualities of a person-a patriot and a citizen-are defined. The key historical and cultural factors are identified and the ideological and theoretical sources that influenced the evolution of the content content of civil and patriotic education in the Belarusian lands during the INCL. An important didactic potential of the traditions of civil and patriotic education, characteristic of the ancient Belarusian literature, is noted. The possibilities of interpreting the historical and cultural experience of our ancestors in the civil and patriotic education of the younger generation in the modern educational process are outlined.*

***Key words****: traditions of civil-patriotic education, civil-patriotic traits and qualities of personality, continuity, patriotism, citizenship, literary heritage.*

**Уводзіны.** Значнай часткай культурнай спадчыны народа з'яўляецца старажытная літаратура, што закладвае не толькі падмурак развіцця пісьмовага мастацкага слова, але і выступае выразнікам аксіялагічных дамінант і светапоглядных арыенціраў пэўнай ментальнай супольнасці. Беларуская літаратура ў гэтым сэнсе не была выключэннем і, нягледзечы на знешнія ўплывы і запазычанасці, мела ў якасці стрыжня нацыянальна-патрыятычную аснову, несла ў сабе значны выхаваўчы патэнцыял.

Мэтай артыкула з'яўляецца выяўленне традыцыйных асноў грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі ў творах старажытнай беларускай літаратуры, вызначэнне вядучых рыс і якасцей чалавека-патрыёта ў творчай спадчыне беларускіх асветнікаў перыяду ВКЛ.

**Метады і метадалогія даследавання.** Пры дапамозе параўнальна-супастаўляльнага метаду і аналізу розных інтэрпрэтацыйных падыходаў да вызначэння вядучых складальнікаў грамадзянска-патрыятычнага выхавання вызначаны запатрабаваныя рысы і якасці патрыёта і грамадзяніна ў гісторыка-культурным кантэксце вывучаемага перыяду. На аснове метадаў логіка-гістарычнага і сістэмна-структурнага аналізу выяўлены асаблівасці развіцця змястоўнага напаўнення грамадзянска-патрыятычнага выхавання пад уплывам сукупнасці знешніх фактараў і ідэйна-тэарэтычных крыніц. Вывучэнне ажыццяўлялася ў адзінстве сістэмнага, аксіялагічнага і культуралагічнага метадалагічных падыходаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Для беларускай літаратуры перыяду Сярэднявечча “вызначальнымі фактарамі, якія дэтэрмінавалі яе жанравую спецыфіку, стылявыя асаблівасці, нават форму і змест”, былі не столькі ўнутраныя літаратурна-эвалюцыйныя працэсы, колькі знешнія гісторыка-культурныя састаўляючыя агульнаеўрапейскага развіцця [1, с. 212]. І калі для ранняга перыяду старажытнай літаратуры (XI – XIII стст.) вядучымі сталі візантыйскія ўплывы ідэй хрысціянства, для наступнага этапу (XIV – першай паловы XVI стст.) штуршком для развіцця паслужылі ідэі гуманізму і талерантнасці, што прынеслі на беларускія землі Рэнесанс і Рэфармацыя, то для позняга этапу старажытнай беларускай літаратуры (XVI – XVII стст.) характэрны водгукі палемічнага працэсу Контррэфармацыі, якія адлюстроўвалі як спрэчкі наконт рэлігійных пытанняў, так і ініцыявалі развіццё грамадска-прававога накірунку літаратуры.

Пры захаванні адзначаных здабыткаў беларускай літаратуры, як і іншым славянскім літаратурам, заўсёды былі ўласцівы пэўная ідэалізацыя і дідактызм, сімвалічнасць і высокі выхаваўчы патэнцыял твораў з яскрава выражанай патрыятычнай скіраванасцю. Як слушна адзначае В. У. Старасценка, для старажытнай літаратуры перыяду ВКЛ характэрны глыбокі выхаваўчы сэнс хрысціянскіх традыцый побач з ідэямі прававой дзяржавы і грамадства, што ўтварылі найцікавейшы “сінтэз хрысціянскага і рэнесанснага этычнага ідэалаў” [5, с. 78]. Такі патрыятычны характар твораў дапамагаў звярнуць асаблівую ўвагу на фарміраванне правільных матываў і стымулаў, выхаванне нацыянальна-арыентаванай асобы з адпаведнымі каштоўнаснымі арыентацыямі.

У творах старажытнай літаратуры знайшло асвятленне ўсхваленне многіх патрыятычных рыс і якасцей, што былі вядомы яшчэ ў народнай педагогіцы беларусаў: любоў і павага да роднай зямлі, беражлівасць і глыбокае разуменне прыроды, імкненне да згуртаванасці і адзінства (Францыск Скарына, Мікалай Гусоўскі, Ян Ліцыній Намыслоўскі).

Пры гэтым важную ролю ў фарміраванні культуры маладога пакалення па-ранейшаму адыграла хрысціянская сістэма каштоўнасцей, якая прадвызначыла вялікую ўвагу да “духоўнага складальніка ўнутранага свету асобы”, што рэалізаваўся праз сістэму ўяўленняў аб сабе, сваім месцы і мэтах свайго існавання [1, с. 44]. Хрысціянства, атрымаўшы шырокае распаўсюджанне на беларускіх землях яшчэ ў перыяд Кіеўскай Русі, з’явілася “ідэалагічнай дактрынай, універсальнай па сваім змесце і сацыяльных функцыях” [5, с. 29].

МГПУ им. И.П.Шамякина

Папулярызацыя ідэалу “духоўна-маральнай дасканаласці” [4, с. 4] атаясамлівалася са служэннем сваёй Радзіме, што праявілася ў дзейнасці беларускіх асветнікаў – Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны і інш. [4, с. 4]. Сярод асобасных якасцей служэнне сваёй зямной Айчыне прызнавалася адной з найважнейшых дабрачыннасцей і важнай маральнай рысай чалавека. Актыўная грамадская дзейнасць, вайсковая служба, абарона дзяржаўных інтарэсаў прызнаваліся царквой праяўленнямі адданасці грамадству, краіне, Богу. Гераізм і самаахвяраванне суседнічалі з міласэрнасцю, клопатам пра іншых і не ўтрымлівалі нянавісці ці пачуцця перавагі над іншымі людзьмі. Гэта спрыяла фарміраванню міралюбівасці, згоды, чуллівасці, абумовіла прыярытэт дыялогу і супрацоўніцтва, што знайшло замацаванне і ў грамадскай думцы і ў творах старажытнай літаратуры (Кірыл Тураўскі, Сімяон Полацкі).

Распаўсюджванне на беларускіх землях ідэй еўрапейскага Рэнесансу абумовіла з’яўленне гуманізму як “універсальнага ідэалагічнага і філасофскага прынцыпу бачання і асэнсавання свету і чалавека” [1, с. 112]. У аснове канцэпцыі гуманізму знаходзілася “рэабілітацыя зямнога жыцця чалавека”, прызначэнне якога разглядалася ў “актыўнай пазнавальнай і практычнай дзейнасці, служэнні грамадству і Айчыне” [5, с. 96]. Пашырэнне гуманістычных ідэй адбывалася ў “спалучэнні з традыцыйнымі праваслаўнымі дамінантамі беларускай культуры” (Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі) [5, с. 102]. Гэта садзейнічала развіццю гуманістычна арыентаваных нацыянальных пачуццяў, абумовіла запатрабаванасць гуманнасці як важнай якасці патрыёта і грамадзяніна на беларускіх землях. Глыбокае перакананне адзінства веры, чалавекалюбства і імкнення быць карысным вызначыла накіраванасць шляхоў удасканалення чалавека і грамадства, праявілася ў творах старажытнай літаратуры.

Ядром этыка-гуманістычных поглядаў беларускіх мысліцеляў Адраджэння з’яўлялася хрысціянская аксіёма: “Итак во всем, как хотите, чтобы с вами поступали люди, так и вы с ними ибо в этом закон и пророки” (Евангелие от Матфея, 7:12) [2, с. 21]. Тым больш, што для замацавання гуманістычных перакананняў існавала прыдатная глеба, падрыхтаваная традыцыямі хрысціянскага чалавекалюбства. Такая інтэрпрэтацыя ідэй гуманізму на беларускіх зямлях прадвызначыла дамінаванне грамадскай карысці, дабра, абавязку ў кантэксце нацыянальна-патрыятычнага развіцця краіны, абумовіла ўвагу да рэфармавання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання, была адзначана ў творах беларускіх асветнікаў (Францыска Скарыны, Міхалона Літвіна, Яна Ліцынія Намыслоўскага).

Рэфармацыйныя ідэі ў ВКЛ абумовілі распаўсюджванне кнігадрукавання, асветы і адукацыі, садзейнічалі пашырэнню гуманістычных ідэй і актывізацыі нацыянальна-культурнага жыцця краіны. Пратэстанцкія вучэнні садзейнічалі асэнсаванню сярод насельніцтва ВКЛ шэрагу нацыянальна-патрыятычных ідэй – значнасці этнакультурных каштоўнасцей, згоды, справядлівасці, роўнасці, грамадзянскай свабоды і канфесійнага міру побач з прыхільнасцю ўласным гісторыка-культурным традыцыям, што адлюстравалася ў фарміраванні зместу выхавання патрыёта і грамадзяніна (Францыск Скарына, Сымон Будны, Андрэй Волан). Ідэолагі Рэфармацыі адстойвалі мірныя асновы жыццядзейнасці ў поліканфесійным грамадстве, падтрымлівалі юрыдычнае замацаванне ў ВКЛ свабоды веравызнання, што з’явілася не толькі адлюстраваннем гісторыка-культурных рэалій ВКЛ, але і значнай прагрэсіўнай заваёвай еўрапейскага маштабу. Дадзеная ідэя знайшла падтрымку ў поглядах Льва Сапегі, Андрэя Волана.

З’явілася аб’ектыўная неабходнасць выхавання людзей законапаслухмяных і адданых новым формам дзяржаўных адносін, зацікаўленых у захаванні цэласнасці і суверэнітэту краіны, нацыянальна-культурных каштоўнасцей і традыцый, што абумовіла эвалюцыю якасных характарыстык патрыёта і грамадзяніна. Гуманістамі падкрэслівалася адукацыйна-выхаваўчая функцыя роднай мовы, яе найгалоўнейшая роля ў выхаванні маладога пакалення. Выключнае месца ў гэтай справе належала з’яўленню літаратуры на роднай мове (творы Францыска Скарыны, Васіля Цяпінскага, Сымона Буднага і інш.). Пераважна багаслоўскі характар такой літаратуры садзейнічаў вырашэнню не толькі выхаваўчых задач. Яе стваральнікі ставілі перад сабой больш маштабныя мэты: далучэнне свайго народа да “навуцы всего доброго” [3, с. 31]. “Всякое писание богом водъхненое полезно ест ко вчению и ко обличению, исправлению, и к наказанию правды”, – лічылі гуманісты [3, с. 30].

На працягу XVI ст. былі выдадзены тры маштабныя заканадаўчыя зводы – Статуты ВКЛ, якія замацавалі шэраг прагрэсіўных прававых прынцыпаў: падзел улады, свабоду веравызнання, прэзумпцыю невінаватасці і інш. Статуты, зацвердзіўшы “дзяржаўны і нацыянальна-культурны суверэнітэт ВКЛ” у складзе Рэчы Паспалітай, выступалі дэманстрацыяй высокай грамадзянска-патрыятычнай годнасці нашых продкаў [5, с. 85]. Дадзеныя дакументы прапагандавалі прыярытэт грамадзянска-патрыятычнай адданасці Радзіме праз грамадска-карысную дзейнасць, разнастайныя формы сацыяльна-палітычнай актыўнасці грамадзян.

Менавіта “жыццё ў адпаведнасці з законам, – на думку Л. Сапегі, – абавязковая ўмова захавання грамадзянскай згоды, цэласнасці і дасягнення “агульнага дабра” [2, с. 270]. У сувязі з гэтым грамадскае ўсхваленне набывае арыентаванасць на асабісты ўдзел у шэрагу дзяржаўных спраў, неабыякавасць да лёсу народа і краіны, адстойванне інтарэсаў Радзімы, што сведчыць пра высокі ўзровень грамадзянскай актыўнасці і правасвядомасці нашых продкаў.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Так, для чалавека Сярэднявечча адказнасць не толькі перад Богам, але і прававая дасведчанасць выступаюць вядучымі матывамі самаразвіцця асобы, важнымі спосабамі захавання пераемнасці і стабільнасці грамадска-палітычнай сістэмы. Прычым характэрнай рысай фарміравання сістэмы правоў і абавязкаў на беларускіх землях з’яўлялася суаднясенне права з маральна-рэлігійнымі каштоўнасцямі: “…а где опять право або статутъ гору маеть, там самъ богъ всимъ владнеть”, – былі ўпэўнены асветнікі [2, с. 271].

**Высновы даследавання.** Выяўлены сутнасна-змястоўныя складнікі грамадзянска-патрыятычнага выхавання, устаноўлены запатрабаваныя для разглядаемага перыяду рысы і якасці чалавека-патрыёта і грамадзяніна як з пазіцыі асобаснай, так і грамадскай накіраванасці. Практычнае значэнне дадзеных высноў абумоўлена магчымасцю выкарыстання вывучанага гісторыка-педагагічнага вопыту ва ўзбагачэнні змястоўнага аспекту арганізацыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання сучаснай моладзі, актывізацыі яго разнастайных формаў, прыёмаў і метадаў на аснове сістэмы традыцыйных каштоўнасцяў. Рашэнне вышэй названых задач адпавядае прыярытэтным кірункам сучаснай выхаваўчай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Гісторыя філасофскай і грамадска-педагагічнай думкі Беларусі : у 6 т. – Мінск : Беларус. навука, 2010. –: Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Т. 2 : Протарэнесанс і Адраджэнне / С.І. Санько [і інш.]. – 840 с.
2. История общественной и философской мысли в Беларуси: раннее и развитое Возрождение : хрестоматия : пособие / авт.-сост. В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2010. – 332 с.
3. История общественной и философской мысли в Беларуси: эпоха Средневековья : хрестоматия : пособие / авт.-сост. В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2009. – 396 с.
4. Каваленя, А. А. Ідэі хрысціянскай маральнасці ў духоўнай спадчыне старажытнай Беларусі / А. А. Каваленя // Проблемы управления. – 2011. – № 1 (38). – С. 1–5.
5. Старостенко, В. В. Становление национального самосознания белорусов: этапы и основополагающие идеи (X–VII вв.) / В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ им. А.А. Кулешова, 2001. – 200 с.


**References**


1. Historia filasofskay and gramadska-pedagichnay thoughts of Belarus : in 6 volumes–Minsk : Belarus. navuka publ., 2010, Vol. 2 : Protarenesans and Adrajenne / S. I. Sanko [et al. ]: Nats. akad. navuk of Belarus, Institute of philology. – 840 P. (In Belarus).
2. The history of social and philosophical thought in Belarus: early and developed Renaissance: a textbook: a manual / author-comp. V. V. Starostenko. – Mogilev : Moscow State University named after A. A. Kuleshov, 2010. – 332 p. (In Russ).
3. The history of social and philosophical thought in Belarus: the Epoch of the Middle Ages: a textbook: a manual / author-comp. V. V. Starostenko. – Mogilev : Moscow State University named after A. A. Kuleshov, 2009. – 396 p. (In Russ).
4. Kovalenya, A. A. Ideas of Christian morality in the spiritual heritage of ancient Belarus / A. A. Kovalenya // Problems of Management. – 2011. – № 1 (38). – Pp. 1–5. (In Belarus).
5. Starostenko, V. V. Formation of the national self-consciousness of Belarusians: stages and fundamental ideas (X–VII centuries) / V.V. Starostenko. – Mogilev : Moscow State University named after A. A. Kuleshov, 2001. – 200 p. (In Russ).


МГПУ им. И.П.Шамякина